УДК 947.6

# ПОЛАЦКІ ДЭКАРАТЫЎНЫ ПОСУД XVI – XVIII СТСТ.

*Д.У. ДУК*

*На падставе вывучэння масавай катэгорыі ганчарнай прадукцыі – дэкаратыўнага керамічнага посуду – вылучаюцца этапы засваення і распаўсюджвання мастацкага стыля барока ў матэрыяльнай культуры палачан. Работа створана на грунце археалагічнага матэрыялу, большасць з якога ўводзіцца ў навуковы ўжытак упершыню.*

Падчас існавання Рэчы Паспалітай Вялікае княства Літоўскае ўваходзіла ў культурную прастору, якая арыентавалася на заходнееўрапейскую мадэль развіцця. Менавіта гэтая прастора са ўсёй ступенню своеасаблівасці стала тым асяроддзем, з якой культурныя навацыі ў выглядзе складаўшыхся мастацкіх школ траплялі далей на ўсход і сталі моцным стымулам для развіцця рускай культуры ў другой палове XVII ст.

У вывучэнні культуры гарадоў Беларусі XVI – XVIII стст. вылучаецца рэгіянальны і агульнадзяржаўны ўзровень. На рэгіянальным узроўні значная роля належыць вывучэнню мясцовай традыцыі і пераемнасці формаў рэалізацыі культурных дасягненняў, у агульнадзяржаўным кантэксце прыярытэт аддаецца высвятленню ступені распаўсюджвання культурнастылёвых напрамкаў, іх генезісу і ўвасабленню ў новых мастацкіх формах. Матэрыяльная культура – не выключэнне. Як цяжка бывае супаставіць знакавую традыцыю, закладзеную ў канкрэтную рэч з яе функцыянальным прызначэннем, настолькі ж бывае цяжка ўсвядоміць сэнс і далейшае адлюстраванне той ці іншай падзеі ў культурным жыцці.

Заўважана, што змены ў арганізацыі жыццёвай прасторы, гэта значыць працэсы, якія непасрэдна вызначаюць прадмет археалогіі, сведчаць пра пераасэнсаванне грамадскіх каштоўнасцяў. З надыходам эпохі Рэнесанса і ранняга Новага часу адбываецца разбурэнне традыцыйнага грамадства. У Вялікім княстве Літоўскім гэты працэс супадае з пашырэннем правоў шляхецтва і колькасным ростам пануючага саслоўя, адасабленнем «эліты» ад «людзей простых». Горад паступова ператвараецца ў цэнтр субкультуры пэўных прафесійных груп. Гарадскія рамеснікі становяцца замкнёнай сацыяльнай адзінкай, што яскрава бачна на прыкладзе цэхавага ўладкавання, іх прадукцыя вырабляецца па замове шляхты і магнатаў, густы апошніх залежаць ад запатрабаванняў, найперш, еўрапейскай моды. Па вызначэнню Пітэра Бэрка, «сістэма цэхаў спрыяла стварэнню рамеснікамі і гандлярамі агульнай культуры, адрознай ад культуры сялян» [1, с. 62].

Яскравым прыкладам «індывідуалізацыі» пабытовай культуры XVI – XVIII стст. служыць рэзкае павелічэнне асартыменту рамеснай прадукцыі ганчароў, якая з гэтага часу не падаецца падлічэнню [2, с. 164]. Асаблівае значэнне набывае эстэтыка. «Эстэтызм» матэрыяльнай культуры прасочваецца ў разнастайнасці аздаблення керамічнага посуду як самай распаўсюджанай у побыце катэгорыі рэчавага матэрыялу. Размаляваны посуд выконваў чыста дэкаратыўную функцыю. Полацкі дэкаратыўны посуд XVI – XVIII стст. прадстаўлены шматлікай групай керамічных вырабаў, выяўленых падчас археалагічных раскопак у гістарычных частках горада. У пераважнай большасці выпадкаў дэкаратыўны посуд не выкарыстоўваўся для гатавання страў і сервіроўкі стала і толькі асобныя вырабы (напрыклад, збаны) зрэдку маглі выкарыстоўвацца ў якасці тарных.

Талеркі як асобны від посуду шырокае распаўсюджванне ў Полацку атрымалі напрыканцы XVI – XVII стст., пры гэтым мяркуецца, што дэкаратыўныя (размаляваныя) талеркі былі цалкам пазбаўлены ўтылітарнай функцыі. На карысць гэтага сцвярджэння прыводзяць факт частага знаходжання фрагментаў размаляваных талерак і меншай колькасці звычайных паліваных. Аднак сляды акапчэння на некаторых дэкаратыўных полацкіх талерках сведчаць, што зрэдку, магчыма па святам, гэты посуд мог выкарыстоўвацца ў якасці сталовага. Па польскіх матэрыялах вядома, што дэкараванне талерак не абавязкова пазбаўляла іх утылітарнай функцыі: напрыклад, некаторыя глыбокія талеркі маглі выкарыстоўвацца для падачы страў [3, с. 227].

З моманту свайго вынаходніцтва керамічны посуд стаў самым распаўсюджаным археалагічным матэрыялам, яго масавай вытворчасці спрыяла, па-першае, шматвяковая традыцыя, па-другое, зручнасць выкарыстання і таннасць сыравіны, па-трэцяе, універсальнасць прызначэння. Як адметная рыса перыяду ранняга Новага часу вылучаюцца разнастайныя тэхнікі дэкаравання керамікі і яе аздабленне да такой ступені, што некаторыя віды посуду губляюць утылітарную функцыю і становяцца творамі мастацтва, шырока прадстаўленымі ў паўсядзённым асяроддзі гараджан. Згодна з даследаваннем І. Ганецкай, дзеля аздаблення беларускага посуду XVI – XVIII стст. майстрамі-керамістамі выкарыстоўвалася каля дзесятка тэхнік жывапісу, выкарыстанне кожнай з якіх патрабавала дакладнага ведання своеасаблівасці матэрыялаў і тэхналогіі іх апрацоўкі [4, с. 165 – 169].

Праблема вывучэння керамікі Новага часу ў беларускай археалогіі [5, с. 129 – 132] актуальна не менш, чым у польскай [6, с. 216 – 217] і рускай [7, с. 244]. Чакаюць разгляду шэраг невырашаных праблем храналогіі і сістэматызацыі начынняў, вывучэнне паліў і тэхнікі іх накладання, віды дэкору і інш.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Складанасць сістэматызацыі форм начынняў заключаецца ў тым, што асартымент керамічных вырабаў (г.зв. «keramiki nowożytnej») у XVII – XVIII стст. не паддаецца падлічэнню [2, с. 164].

У першай палове XVI ст. адбываецца пераход да новых тэхналогій вырабу керамікі, абумоўленай выкарыстаннем нажнога ганчарнага круга, да сярэдзіны XVI ст. частка полацкага посуду (паліванага і невялікай колькасці непаліванага) была выраблена на нажным ганчарным крузе [8, с. 127]. У гэты час ідзе актыўны пошук сыравіны для непаліваных вырабаў, прыдатнай для выцягвання на нажным ганчарным крузе і дастаткова жарастойкай. Полацкія матэрыялы XVI ст. дазваляюць сцвярджаць аб паслядоўным развіцці тэхналагічных прыёмаў цэнтральнаеўрапейскага ганчарства. Напрыклад, масавае ўкараненне тэхнікі «тачэння» посуду ў Польшчы прыпадае на сярэдзіну XVI ст. [2, с. 163; 9, с. 77], аналагічныя працэсы ў Полацку адбываліся ў канцы XVI – першай трэці XVII стст., што звязана з наступствамі Інфлянцкай вайны. Новыя прыёмы, абумоўленыя распаўсюджваннем нажнога круга, значна апярэджвалі развіццё ўсходняй (маскоўскай) керамічнай вытворчасці амаль на цэлае стагоддзе [10, с. 159], нават у памежным з Полаччынай Смаленску з'яўленне «тачонай» керамікі фіксуецца не раней другой паловы XVII ст. [7, с. 239], і хаця формы смаленскага посуду часта дублююць маскоўскую кераміку, тэхніка нанясення паліў паступова набліжаецца да беларускіх аналагаў [7, с. 242 – 244].

Полацкі посуд XVI – XVIII стст. вельмі разнастайны па форме і прызначэнню. Традыцыйны для беларускай археалогіі метад тыпалагізацыі па функцыянальнаму прызначэнню падзяляе яго на посуд для гатавання ежы (кухонны), сталовы, тарны, гігіенічны і дэкаратыўны [11, с. 24]. У іншых выпадках за аснову бярэцца тэхналагічныя асаблівасці (склад) керамічных мас і паліў, ці спосаб нанясення арнаменту (для паліваных вырабаў) [5, с. 131], пры гэтым метады макраскапічнага назірання і параўнаўчага аналізу з'яўляюцца прыярытэтнымі [9, с. 50].

Сярод усяго керамічнага посуду першай паловы XVI ст. у адным раскопе паліваныя начынні склалі ўсяго толькі 2,7 % знаходак[1], у другой палове – канцы XVI ст. ужо 15,2 % [8, с. 127], у XVII – XVIII стст. паліваны посуд перавышае па колькасці непаліваны і дасягае 55 – 63,6 % ад агульнай масы посуду ў адным раскопе [12, мал. 46].

У дадзеным артыкуле прапануецца сістэматызацыя полацкага распіснога посуду XVI – XVIII стст., сабранага падчас археалагічных раскопак у гістарычных частках Полацка і ўвядзенне ў навуковы ўжытак новых археалагічных матэрыялаў. Пры разглядзе полацкага распіснога посуду абраны метад вылучэння асобных груп вырабаў па тэхніцы нанясення роспісу. Прапануецца падзел па формам размаляваных талерак як самага распаўсюджанага археалагічнага матэрыялу сярод дэкаратыўнага посуду. Вылучаюцца тры асноўныя прыёмы (спосабы) роспісу, якія характарызуюць полацкую вытворчасць.

Першы прыём – гэта роспіс белым ці падфарбаваным ангобам па сухому чарапку [11, с. 56]. Раслінны ці геаметрычны арнамент, выкананы белым ангобам, наносіўся адразу на чарапок, пасля чаго пакрываўся празрыстай палівай карычневага ці зялёнага адцення. Посуд гэтай групы можна лічыць найбольш архаічным, на некаторых талерках па знешняму боку захаваліся сляды акапчэння [13, кп-14, № 9926], што можа сведчыць аб выкарыстанні іх не толькі для падачы ежы, але і для яе падагрэву.

У Полацку зварот да аналагічнага спосабу аздаблення посуду адзначаецца ў XVIII – XIX стст., у гэты час ён ужываецца на шырокім спектры керамічных вырабаў, пры гэтым дэкор усё больш развіваецца па шляху спрашчэння і стандартызацыі.

Асаблівасць другога прыёма заключаецца ў роспісу каляровымі палівамі па беламу ангобнаму фону [14, с. 28]. Заўважана, што ў Полацку посуд гэтай групы быў не вельмі распаўсюджаны [11, с. 56], ён у асноўным прадстаўлены размаляванымі збанамі і талеркамі. На адной цэлай талерцы [13, кп-14, № 9921] па слою белага ангоба была выкарыстана тэхніка роспісу карычневымі глінкамі ў выглядзе хвалістага аднарадавага арнамента па борціку і донцу, бясколерная паліва надала вырабу жаўтаватае адценне. Нярэдка ангабаваліся таксама наружныя сценкі талерак [13 кп-14, № 9926], на якіх захоўваліся адбіткі пальцаў рамесніка. Такі посуд абпальваўся два разы – першы раз пасля фармоўкі вырабу на ганчарным крузе і накладання слоя ангоба, другі – пасля нанясення бясколернай палівы. Керамічнае цеста такога посуду вельмі якаснае, чарапок двухслойны, з плаўным пераходам ад шэрага да чырвонага колеру, порысты, утрымлівае мелказярністыя дамешкі.

Зазначым, што тэхніка роспісу начынняў керамічнымі фарбамі па беламу ангобу (так званая паўмаёліка) была распаўсюджана ў Польшчы толькі ў сярэдзіне XVII ст. [15, с. 249], тады як аналагічны посуд на Беларусі напрыканцы XVI ст. ужо асобна не ўжываецца [8, с. 127], храналагічна ён бытуе разам з роспісам асобных элементаў дэкора ангобам пад паліву. Не выключана, што традыцыю роспісу цёмнымі фарбамі па беламу ангобу пад паліву беларускія майстры пераймалі з Усходу (Візантыя, Залатая Арда), дзе ў XIV – XV стст. існавалі цэнтры па вытворчасці паўмаёлікавай керамікі аналагічнага тыпу [16, с. 94 – 98].

Трэці прыём – самы распаўсюджаны – гэта роспіс посуду светлымі каляровымі глінкамі па цёмнаму ангобнаму фону пад бясколерную паліву.

[1] Па матэрыялах раскопак аўтара ў 2001 г. на тэрыторыі Ваеннага шпіталя (былога Кадэцкага корпуса ў г. Полацку).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Увесь працэс роспісу праводзіўся ў некалькі этапаў. На прасушаную пасля фармоўкі паверхню талеркі наносіўся тонкі слой карычневага ангоба. У якасці фарбавальніка мог выкарыстоўвацца аксід марганца [17, с. 134], што надавала пакрыццю дадатковую трываласць і якасць сілікатных вырабаў.

Спосаб нанясення фонавага ангобу на паверхню выраба можна рэканструяваць наступным чынам. Спачатку талерку ставілі на ганчарнае кола і, рухаючы яго, спецыяльнай шчоткай наносілі ангоб. Кансістэнцыя раствора павінна была быць сметанковай, таму пры спалучэнні з керамічнай паверхняй атрымоўваліся натуральныя разводы (тэхніка «вільготнай» размалёўкі). Часам раствор палівы быў занадта вадкі, у такіх выпадках пры спалучэнні фонавых ангобаў борціка і прыдоннай частцы мелі месца зацёкі палівы, што пагаршала якасць вырабаў. На падсушаную сілікатную аснову з дапамогай ражка наносіўся малюнак, звычайна ён накладаўся тоўстым слоем белага ангоба па контуру выявы (таўшчыня ангоба вар'іруецца ад 1 да 1,5 мм). У некаторых месцах малюнак мае сляды зацёкаў карычневага колеру – сведчанне ўзаемадзеяння з фонавым ангобам пры абпале. Некаторыя разнавіднасці арнаменту ўтрымліваюць запаўненне контура свінцовымі палівамі па ангобу з рознымі адценнямі зялёнага колеру. Пры такім спосабе падфарбоўкі абрысы колеру нетрывалыя (размытыя), што дазваляе зрабіць выснову аб аднвчасовасці нанясення малюнку. Пасля гэтага прасушаны выраб падвяргаўся першаснаму абпалу.

На карысць падвойнага абпалу сведчаць наступныя тэхналагічныя прыкметы, выяўленныя пры макраскапічным назіранні, а менавіта: адсутнасць зацямнёных праслоек глінянага чарапка пад слоем ангоба, якія ўтвараюцца, звычайна, пры першасным абпале з ужо нанесенай палівай. Бясколерная паліва, якой праводзілася канчатковая апрацоўка паверхні вырабу, часта захоўвала зеленаватае ці жаўтаватае адценне, яна наносілася праз пытлік (ад чэшскага pytlik – мяшок), пасля чаго выраб паўторна абпальваўся. Бясколерная паліва надавала паверхні бляск, дадатковую насычанасць і глыбіню цёмнай фонавай паверхні.

Малюнак роспісу талерак, як самай распаўсюджанай катэгорыі знаходак, традыцыйна падзяляецца на тры групы. Да першай адносяцца талеркі, распісаныя па борціку, донца выдзелена некалькімі канцэнтрычнымі кругамі (мал. 1, *а*)[1]. Талеркі другой групы ўнутры гэтых канцэнтрычных кругоў маюць малюнак, і такім чынам арнаментальнае поле падзелена на дзве зоны (мал. 1, *б*). Трэцюю групу складаюць талеркі з суцэльнай арнаментацыяй па борціку, донцу і прыдоннай частцы (мал. 1, *в*) [11, с. 56]. Неабходна дадаць, што часта фонавая паверхня размалёўвалася двума колерамі: донца і прыдонная частка ў цёмна-зялёны колер (магчыма, з дапамогай аксіда жалеза), борцік – у цёмна-карычневы колер, што надавала вырабу дадатковую каларыстычнасць.

У Полацку тэхніка контурнага роспісу белым ангобам па цёмнай фонавай паверхні характэрна ад часоў 30 – 40-х гг. да 70 – 80-х гг. XVII ст. [8, с. 127]. Распаўсюджванне гэтага прыёму роспісу на Полаччыне ў другой чвэрці XVII ст. можна звязаць з уплывам рамеснай вытворчасці нямецкіх земляў паўднёвай Маравіі, усходняй Германіі і Баварыі [5, с. 131]. Адзначым, што заходні – нямецкі, нідэрланскі, польскі – культурны ўплыў адзначаецца на шырокім спектры керамічных вырабаў полацкіх майстроў XIV – XVIII стст. (кафля, посуд, мелкія керамічныя групы), знешнія культурныя запазычанні значна паўплывалі на развіццё полацкага рамяства ў адзначаны перыяд.

Намі зроблена класіфікацыя форм полацкіх размаляваных талерак з калекцый, што захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. У якасці аб'екту аналіза абраны посуд, профіль якога захаваўся цалкам, ці яго можна графічна рэканструяваць. Найбольш прадстаўнічая калекцыя полацкіх размаляваных талерак паходзіць з раскопа Н.І. Здановіч у двары дзіцячай мастацкай школы, дзе размаляваныя талеркі складалі каля 30 % усяго посуду з аднаго раскопа [11, с. 56].

Неабходна адзначыць, што па знешніх прыкметах не заўсёды ўдаецца вызначыць храналагічны дыяпазон бытавання той ці іншай групы дэкаратыўнага посуду. Адзіным устойлівым крытэрыем з'яўляецца тэхніка нанясення арнаменту на адфармаваны выраб. Зыходзячы з гэтага, полацкі размаляваны посуд быў падзелены на тры групы: начынні канца XVI – пачатку XVII стст. з падпаліўным роспісам па беламу ангобу ці з роспісам светлым ангобам асобных дэталяў дэкору па чарапку пад паліву, посуд другой трэці – канца XVII ст. з падпаліўным роспісам светлымі ангобамі па цёмнаму ангобнаму фону і посуд першай паловы XVIII ст. з падпаліўным ангобным роспісам і з роспісам па эмалі.

Першая група – гэта талеркі канца XVI – пачатку XVII стст., дыяметр па краю борціка складае ад 26 да 32 см, дыяметр донца ад 11 да 13 см. Талеркі маюць складанапрафіляванае венца з рабром па унутранаму краю (мал. 2, *а*), а таксама адагнутае ў выглядзе манжэты венца са зрэзаным звонку краем (мал. 2, *б*, *в*).

Талеркі другой трэці – канца XVII ст. (другая група) маюць дыяметр па краю борціка ад 22,5 да 34 см і дыяметр донца ад 6,5 да 15 см. Талеркі (мал. 2, *г*, *д*, *е*) і паўміскі (мал. 2, *ж*, *п*) тыпу I маюць складанапрафіляванае венца з вострым рабром па ўнутранаму краю, адна талерка мае рабро паўкруглай формы (мал. 2, *р*).

[1] Класіфікацыя форм начынняў праведзена па матэрыялах раскопак Н.І. Здановіч, С.В. Тарасава і аўтара, што захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 1. Дэкаратыўны посуд XVII – XVIII стст.:
*а – в* – талеркі (раскопкі Н.І. Здановіч); *г* – маёлікавы кветнічак (раскопкі Д.У. Дук)

Талеркі тыпу II маюць складанапрафіляванае венца з двума рэбрамі па ўнутранаму краю (мал. 2, *з*, *і*).

Да III тыпу належаць талеркі з адагнутым у выглядзе карнізіка венцам, пад якім праходзіць раўчук (мал. 2, *к*, *л*).

IV тып – гэта талеркі са знешне патоўшчаным венцам-манжэтай (мал. 2, *м*, *н*).

Да трэцяй групы полацкага распіснога посуду належыць талерка поўнага профілю першай паловы XVIII ст. з роспісам па эмалі. Талерка мае загнутае унутр венца са зрэзаным краем і вогнутае донца (мал. 2, *о*). Аналагічнае венца мае паўмісак пачатку XVIII ст. і талерка з вялікім пляскатым донцам дыяметрам 15 см – гэтыя начынні выраблены ў традыцыйнай для XVII ст. тэхніцы падпаліўнога ангобнага роспісу (мал. 2, *с*, *т*).

Донцы ўсіх полацкіх талерак захавалі сляды зразання ніткай з ганчарнага круга. Некаторыя талеркі пасля гэтага былі пастаўлены на падсыпку з пяску, магчыма для абпалу, некаторыя донцы ўтрымліваюць сляды ад загладжвання, адбіткі пальцаў рамесніка, барозны ад драўляных трэсак. Адзначаныя прыкметы характэрны, у большасці, для талерак канца XVI – першай паловы XVII ст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 2. Дэкаратыўны посуд XVI – XVIII стст.:
*а – е, з – о, р – с* – талеркі; *ж, п, т* – паўміскі (раскопкі Н.І. Здановіч)



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У Полацку была распаўсюджана складаная тэхніка контурнага роспісу марганцам з наступным запаўненнем дэталяў малюнкаў каляровымі эмалямі. Контур рабіўся эмаллю вязкай кансістэнцыі пры дапамозе ражка і выконваў функцыю перагародак у ювелірнай тэхніцы перагародчатых эмаляў [18, с. 33]. Посуд гэтай групы нешматлікі, у Полацку знойдзены толькі асобныя фрагменты начынняў, адзін з якіх ад куфля [18, мал. 11: 1].

З канца XVII ст. некаторыя віды эмалевага посуду набываюць выгляд «пад фаянс», пад якім трэба разумець італьянскі фаянс эпохі Рэнесанса [5, с. 131; 19, с. 50]. Мяркуецца, што новая мода выклікала карэнныя змены ў тэхналогіі аздаблення вырабаў. Цяпер керамічную паверхню спачатку пакрывалі белай эмаллю, потым пэндзлем наносілі аднатонны ці каляровы малюнак, у якасці фарбаў ўжывалі вадкія палівы. Прыкладам такога роспісу з'яўляюцца талеркі другой чвэрці XVIII ст. з раслінным арнаментыкай [13, кп-14, № 9927]. Роспіс зроблены па белай эмалі, пры гэтым шырока выкарыстоўваюцца рознакаляровыя палівы: лісце раслін – зялёнага колеру, кветкі – блакітныя, сцеблі раслін выкананы чырвонай керамічнай фарбай.

У якасці класічнага прыклада ўжывання маёлікавага роспісу трэба прывесці знойдзены намі дэкаратыўны збанок пачатку XVIII ст. Двухбаковы роспіс зроблены рознакаляровымі глухімі эмалямі: знутры – жоўтай, звонку – белай, па якой чорнай контурнай фарбай з бірузовым запаўненнем пэндзлем нанесены раслінны арнамент у выглядзе парасткаў кветак з бутонамі (мал. 1, *г*). Аналагічны тып збанка з падобным малюнкам, маёлікавым роспісам і датай «1683» знойдзены ва Уніёвіце (Польшча) [19, tabl. XXVII/3], на Беларусі кветнічкі з маёлікавым роспісам знойдзены ў Гродне ў пластах XVIII ст. [11, мал. 119]. Верагодна, полацкі кветнічак быў выраблены ў прамежку часу з канца XVII да другой чвэрці XVIII стст.

Трэба адзначыць, што на тэрыторыі Беларусі, таксама як і на суседніх землях Цэнтральнай і Паўночнай Еўропы, вытворчасць маёлікі імітавала рэнесансныя ўзоры посуду з Італіі, выкананыя з белай гліны і пакрытыя белай глухой палівай з багатым роспісам шклянымі фарбамі (маёліка ў вузкім сэнсе) [5, с. 131]. У Вялікім княстве Літоўскім і ў Польшчы шырокае распаўсюджванне атрымала тэхніка суцэльнага роспісу белай непразрыстай цаніннай палівай па добраякаснаму чырвонаму керамічнаму чарапку. На паліву фарбамі наносілася дадатковая арнаментыка і начынне нанава абпальвалася; у выніку атрымоўваўся маёлікавы роспіс на чырвонагліняны керамічнай аснове [19, с. 50 – 51].

Асобнай катэгорыяй знаходак прадстаўлены посуд, які трапіў у Полацк з Усходу. Да гэтай катэгорыі адносяцца дробныя кавалкі размаляваных начынняў (мал. 3, *а* – *е*).




Мал. 3. Фрагменты імпартаванай керамікі XVI – XVIII стст. (раскопкі – Д.У. Дук)



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Усе яны маюць светла-шэры порысты чарапок з невялікімі дамешкамі дробназярністага пяску і адфармаваныя на нажным ганчарным крузе. Посуд пакрыты глухімі эмалямі з абодвух бакоў, пры гэтым посуд XVI ст. значна адрозніваецца ад аналагічнай групы начынняў XVII – XVIII стст.

Да ліку керамікі XVI ст. адносяцца тры фрагмента піялы (?), звонку пакрытыя рознакаляровымі эмалямі белага, сіняга, зялёнага і карычневага колеру ў чорнай акантоўцы (мал. 3, *а*, *в* – *г*): усё разам гэта ўтварае раслінна-геаметрычны арнамент. Рады волнаў чаргуюцца з кропкамі і выявамі васьміпялёсткавых кветак. Знутры гэты посуд размаляваны фарбамі карычневых адценняў па беламу эмалеваму фону.

Фрагмент вазы (?) XVII – XVIII стст. знутры пакрыты белай глухой палівай, а звонку – сіняй. Начынне мае дэкараваную рэльефным арнаментам паверхню, якая дадаткова аздоблена белым колерам (мал. 3, *е*). Венца белаглінянага кубка (?) з тонкімі сценкамі звонку пакрыта празрыстай саляной палівай, венца кубка мае дыяметр 6 см (мал. 3, *д*).

Па вызначэнню І.У. Ганецкай (праведзена падчас вуснай кансультацыі), гэтая група размаляванага посуду была прывезена ў Полацк з Блізкага Усходу – у XVI ст. такую кераміку выраблялі на тэрыторыі Турцыі.

Такім чынам, полацкі размаляваны посуд XVI – XVIII стст. прадстаўлены даволі вялікай калекцыяй разнастайных па форме і прызначэнню вырабаў. Асартымент дэкаратыўнага посуду, знойдзены пры археалагічных даследаваннях, дазволіў вызначыць храналагічныя дыяпазоны і шляхі распаўсюджвання асобных тэхналогій роспісу і фармоўкі вырабаў у межах станаўлення мастацкіх стыляў ранняга барока ці маньерызма (канец XVI – першая чвэрць XVII стст.) і развітага барока (30-я гг. XVII – сярэдзіна XVIII стст.).

Работа выканана пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Бэрк П. Народная культура Эўропы ранняга Новага часу. – Мн.: Тэхналогія, 1999. – 380 с.
2. Gaewska M. Garncarstwo nowożytne w Polsce. Stan i potrzeby badań // Prace i materyały muzeum archeologicznego i etnograficznego w Łodzi. Sr. Archeologiczna, 1989 – 1990, № 36. – S. 159 – 169.
3. Urbaniak W. Zbior nowożytnej ceramiki naczyniowej z podwórza przy ul. Jezuickiej 5 w Lublinie // Archeologia Polski Środkowowschodniej. T. V, Red. J. Gurba – Lublin: «Print 6», 2000. – S. 215 – 229.
4. Ганецкая І. Тэхналогія дэкаратыўнай апрацоўкі маёлікавых вырабаў на Беларусі ў XVI – XVIII стст. // З глыбі вякоў. Наш край: Гісторыка-культуралагічны зборнік. – Мн.: МП «Крок уперад», 1992. – С. 165 – 179.
5. Зайцева О.Е. Поливная посуда: некоторые методологические аспекты проблемы // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 1993. – № 10. – С. 129 – 132.
6. Kajzer J. Wstęp do archeologii historycznej w Polsce. – Lódz, Wyd. Uniwersitetu Lódzkiego, 1996. – 267 s., il.
7. Сергина Т.В. Поливная посуда из Смоленска // Советская археология. – 1981. – № 2. – С. 233 – 244.
8. Здановіч Н.І. Комплекс рэчаў з пабудовы XVI ст. з Полацка // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: Матэрыялы III міжнар. навук. канф. – Полацк, 1998. – С. 125 – 140.
9. Kruppé J. Garnczarstwo warszawskie w wiekach XIV o XV. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd. Polskiej Akademii nauk, 1967. – 285 s., il.
10. Рабинович М.Г. Московская керамика // Материалы и исследования по археологии СССР. – № 12. – Т. II. – М., Л., 1949. – С. 57 – 105.
11. Здановіч Н.І., Трусаў А.А. Беларуская паліваная кераміка XI – XVIII стст. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 183 с., іл.
12. Тарасаў С.В. Полацк IX – XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 183 с., іл.
13. Нацыянальны полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.
14. Ганецкая І.У., Здановіч Н.І. Дэкаратыўная кераміка // Час, помнікі, людзі. Памяці рэпрэсаваных археолагаў: Тэз. дакл. міжнар. канф. – Мн., 1993. – С. 27 – 30.
15. Dąbrowska M., Gajewska M., Kruppé J., Późnośredniowieczne i nowożytne naczynia gliniane oraz kafle. Komentarz do analizy // Sandomierz: bądania 1969 – 1973 / Polskie badania archeologiczne. T. 31. Red. S. Tabaczyński. – Warszawa: Zaklad Wydawniczy Letter Quality, 1993. – S. 240 – 261.
16. Коваль В.Ю. Керамика Востока в средневековой Москве (опыт систематизации) // Российская археология. – 1997. – № 3. – С. 94 – 113.
17. Зайцева О.Е. Поливная посуда второй половины XVI – XVII вв. из Друи // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 1993. – № 10. – С. 133 – 143.
18. Ганецкая І.У. Маёліка на Беларусі ў XI – XVIII стст. – Мн., 1995. – 120 с.: іл.
19. Mikołajczyk A. Naczynia datowane skarbami monet XIV – XVIII w. na ziemiach polskich. – Wrocław, Warszawa, Kraków, Gdańsk, 1977. – 183 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова